УДК 94 (476) "1639"

# "ПРЫ СКЛАДАННІ НІЖЭЙШАГА ПАКЛОНУ": НЕВЯДОМАЯ ІНСТРУКЦЫЯ ПОЛАЦКАЙ ШЛЯХТЫ НА СОЙМ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ 1639 г.

***канд. гіст. навук, дац. В. У. ГАЛУБОВІЧ***
***(Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт)***

*У артыкуле разглядаюцца абставіны стварэння і аналізуецца змест інструкцыі полацкай шляхты, складзенай напярэдадні сойма Рэчы Паспалітай, праведзенага ў кастрычніку-лістападзе 1639 г. Пастулаты полацкага сойміка, які адбыўся ў канцы жніўня 1639 г., упершыню з'яўляюцца прадметам асобнага даследавання. Да ўнікальнай, раней невядомай у гістарыяграфіі, інфармацыі з выяўленага ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі дакумента адносяцца імёны полацкіх паслоў на сойм. Звесткі інструкцыі дазваляюць скарэктаваць і ўдакладніць шэраг вядомых фактаў. Самі пункты інструкцыі дазваляюць вызначыць палітычныя прыярытэты, актуальныя для Полацкага ваяводства напярэдадні сойма. Забарона ўводзіць новыя падаткі і вялікая колькасць патрабаванняў, датычных лакальных праблем ваяводства, былі вынесеныя на першыя старонкі інструкцыі, што выразна сведчыць пра ігнараванне мясцовай шляхтай асноўных пажаданняў, выказаных у каралеўскім пасланні на соймік.*

*У дадатку да артыкула публікуецца тэкст інструкцыі.*

***Ключавыя словы:*** *пасольская інструкцыя, полацкая шляхта, павятовы соймік, сойм 1639 г.*

***Уводзіны.*** Яшчэ ў 1972 г. польская даследчыца Соф'я Травіцкая, аўтар асобнай працы пра сойм Рэчы Паспалітай 1639 г., заўважыла, што далёка не ўсе пасольскія інструкцыі, складзеныя шляхтай перад гэтым форумам, захаваліся, а некаторыя яшчэ чакаюць свайго "*шчаслівага адкрыцця*" [1, s. 555]. Сама С. Травіцкая ведала і выкарыстала толькі дзве інструкцыі 1639 г. шляхты Вялікага Княства Літоўскага: ваўкавыскую і наваградскую [1, s. 556–558]. На сённяшні дзень да гэтага сціплага спіса трэба дадаць полацкую інструкцыю, якая захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі [2, арк. 22–22 адв.]. Такім чынам, пазіцыі і прапановы прадстаўніцтва ВКЛ на сойме Рэчы Паспалітай можна рэканструіраваць дзякуючы пастулатам ужо трох беларускіх паветаў, у тым ліку і Полацкага.

Большая частка пасольскіх інструкцый полацкай шляхты на соймы Рэчы Паспалітай канца XVI – першай паловы XVII ст. да нашага часу не дайшла ні ў арыгіналах, ні ў копіях, а тыя з іх, што вядомы, зберагаюцца ў архівах Польшчы і Расіі [3, с. 92–164]. Дагэтуль фактычна ні водзін складзены да сярэдзіны XVII ст. наказ полацкай шляхты з беларускіх архіваў не быў уведзены ў навуковае абарачэнне даследчыкамі, хаця такія магчымасці існавалі. Так, вопіс, дзе ўтрымліваецца інфармацыя пра інструкцыю 1639 г., быў падрыхтаваны ў НГАБ яшчэ ў 1984 г. [4]. Лёс полацкай інструкцыі 1639 г. можна аднавіць толькі ў агульных рысах. Запісы на маргіналіях (паметка "№ 114 Fasc 24 Kiszczy*n*") і сам змест інструкцыі дазваляюць дапускаць, што пачаткова дакумент знаходзіўся ў архіве магнацкай сям'і Кішкаў, а пазней апынуўся ў складзе архіва Радзівілаў: у структуры варшаўскай часткі якога маецца асобны аддзел з паперамі Кішкаў [5]. Уласна ў радзівілаўскім фондзе НГАБ і зберагаецца полацкая інструкцыя. Яна з'яўляецца часткай не вельмі аб'ёмнай справы (27 аркушоў), асноўны змест, геаграфія і храналогія дакументаў якой (а гэта гаспадарчыя матэрыял за 1629–1841 гг.) ніяк не звязаны з палітычнымі падзеямі 1639 г. [2]. Відавочна, што полацкая інструкцыя, а дакладней, яе фрагмент, была механічна ці выпадкова ўключана ў склад гэтай адзінкі захоўвання ў НГАБ па прычыне невялікага аб'ёму – аднаго аркуша, запісанага з двух бакоў. Сам дакумент складзены на польскай мове, што з'яўляецца на 1630-я гады нормай для справаводства полацкага павятовага сойміка. Фармуляр інструкцыі стандартны і ўтрымлівае шаблонныя для такога віда дакументаў элементы [6, s. 134].

***Акалічнасці стварэння інструкцыі.*** Пасольская інструкцыя полацкай шляхты была створана напярэдадні звычайнага сойма Рэчы Паспалітай, які адбываўся ў Варшаве на працягу 5 кастрычніка – 16 лістапада 1639 г. Соймікавая кампанія стартавала яшчэ летам, а перадсоймавыя выбары і нарады шляхта павінна была правесці 25 жніўня 1639 г. [1, s. 552]. Так было ў Кароне, у ВКЛ соймікі адбыліся пазней: напрыклад, у Наваградку пасольская інструкцыя была складзена 27 жніўня [7]. Мемуарыст і ўдзельнік сойма, пасол ад наваградскага ваяводства, Піліп Казімір Абуховіч вельмі трапна ахарактарызаваў агульную атмасферу, якая панавала напярэдадні нарадаў: "*У тым жа годзе ў кастрычніку быў склiканы сойм … пры незадаволенасці ўсіх станаў Рэчы Паспалітай ад частага звыш устаноўленага правам соймавання*"[8, s. 215]. Для ВКЛ гэты сойм меў асаблівую значнасць, паколькі прадстаўнікі княства на падставе дайшоўшай чаргі атрымлівалі права выбіраць свайго маршалка. Такім чынам, соймавым спікерам у 1639 г. у выніку пэўных маніпуляцый і пры падтрымцы палякаў-каталікоў, якія баяліся кандыдата-пратэстанта Пятра Кахлеўскага, быў абраны гарадзенскі земскі пісар Уладзіслаў Кердзей [1, s. 567–568].

Сойм 1639 г. быў першым сарваным форумам у гісторыі Рэчы Паспалітай, паколькі скончыўся без зацвярджэння канстытуцый. Фактычна гэта азначала змарнаванне ўсіх высілкаў, якія дзяржава і грамадства інвеставалі ў яго падрыхтоўку і правядзенне.

***Паслы.*** Найбольш каштоўная інфармацыя, якая ўтрымліваецца ў інструкцыі, датычыцца абраных на перадсоймавым сойміке паслоў. *Па-першае*, іх імёны не згадваюцца ў ранейшых публікацыях, як замежных, так і айчынных [9]. Згодна з дакументам, пасламі ад полацкага сойміка былі абраны ***Валерыян Яўгель*** і ***Аляксандр Віскоўскі***. *Па-другое*, першы з паслоў, Валерыян Яўгель, згаданы як ураднік, а дакладней, ён названы ***полацкім гараднічым***, што дазваляе скарэктаваць дадзеныя, вядомыя ў гістарыяграфіі, і ўпэўнена сцвярджаць, што, прынамсі, да восені 1639 г. менавіта ён, а не іншая асоба, займаў гэтую пасаду: *на пасаду гараднічага В. Яўгель быў намінаваны 7 сакавіка 1631 г., але адносна таго, як доўга яе займаў дакладнай інфармацыі няма: яго пераемнікам, паводле некаторых крыніц, у 1634 г. называюць Мікалая Пётуха Кубліцкага, які, пазней, магчыма, у 1645 г., з'яўляўся гараднічым* [10, s. 97].

Некалькі слоў трэба сказаць пра саміх паслоў. Абодва яны не належалі да родаў генетычна полацкіх, паколькі ні Яўгелі, ні Віскоўскія не згадваюцца ў рэвізіі Полацкага ваяводства 1552 г. [11], а ў рэестрах XVII ст. звесткі пра прадстаўнікоў гэтых сем'яў вельмі абмежаваныя [12].

Пра слабую прывязку Яўгеляў да Полаччыны ў XVII ст. сведчыць нязначнасць іх мясцовых уладаняў: толькі адзін прадстаўнік сям'і, Міхал Яўгель, згадваецца ў падаткавым рэестры Полацкага ваяводства 1667 г. і толькі ў кантэксце "застаўных" адносінаў [12, s. 42]. Тым не менш, пра полацкіх Яўгеляў, у тым ліку гараднічага Валерыяна, які карыстаўся гербам "Лебедзь", згадвае ў складзеным у сярэдзіне XVII ст. гербоўніку Войцех Віюк Каяловіч [13, s. 120]. Валерыяна Яўгеля нельга назваць асобай вельмі ўплывовай, але заўважнай як у ВКЛ, так і не апошняй у мясцовым асяроддзі. Прамым паказнікам жыццёвых "поспехаў" Валерыяна з'яўляецца не толькі атрыманне ад Жыгімонта Вазы забяспечанай сталым прыбыткам пасады, але і яго сувязі з полацкай элітай. Сваяцкімі адносінамі Валерыян быў звязаны з уплывовым урадніцкім кланам Тышкевічаў, персанальна праз Міхала Тышкевіча, які прайшоў усе этапы кар'ернага росту ў межах полацкага земскага суда [10, s. 97, 150, 168, 194]. Не ў апошнюю чаргу праз сваяцтва з Тышкевічамі полацкі гараднічы апынуўся у ліку палітычнага актыву Полацкага ваяводства, соймік якога абіраў Валерыяна паслом на элекцыйны сойм у 1632 г. [10, s. 97] і, як высвятляецца, яшчэ раз у 1639 г. Асобны эпізод з Яўгелем адбыўся ў 1638 г., калі полацкія абывацелі запатрабавалі ад сваіх соймавых паслоў, каб на ўзроўні парламента праз канстытуцыю было вызначана "*упрывіліяванае*" месца полацкаму гараднічаму на мясцовых сойміках. Цікава, што за ўзор належала ўзяць парадак засядання віцебскіх ураднікаў на сойміках, дзе гараднічаму належала займаць месца адразу пасля земскага пісара [14, с. 167 об.]. Пры гэтым нікога, відаць, асабліва не турбавала, што полацкая адміністрацыя ператвалася ў сямейнае прадпрыемства, суцэльную "сцяну" з сваякоў.

Аляксандр Віскоўскі на момант абрання паслом ужо меў пэўны вопыт публічнай працы. Невядома, ці абіраўся ён раней ці пазней 1639 г. паслом, але дакладна карыстаўся дастатковым аўтарытэтам у мясцовых абывацеляў, каб выконваць функцыі дэпутата Галоўнага суда ВКЛ: з'яўляўся суддзёй вышэйшай апеляцыйнай установы ВКЛ у 1642 г. [15, s. 239]. Грамадскі актывізм Віскоўскага грунтаваўся на тым, што можна назваць родавай салідарнасцю. Несумненна, што на сойміках у Полацку ён прадстаўляў інтарэсы сваёй сям'і, якая неаднаразова згадваецца ў петыцыях з просьбамі кампенсацыі за страчаныя ўладанні на тэрыторыі «Невельскага тракта». У 1640 г. прысутны на сойміке ў Полацку Аляксандр Віскоўскі не толькі знайшоў магчымасць інкарпараваць у пасольскую інструкцыю просьбу сваёй сям'і, але і атрымаў персанальную падтрымку ад прысутных абывацелей, якія адзначылі яго заслугі «*выяўленыя, як у розных экспедыцыях, так і ў нашым ваяводстве пры розных аказіях, з набыццём вялікіх шванкаў і калецтва на целе*» [16, s. 7]. На часы Уладзіслава Вазы прыпаў пік і фінал кар'еры Віскоўскага, які, «*пасля пагарэння полацкага замка*», атрымаў ад манарха 10 ліпеня 1645 г. прывілей на ўрад полацкага будаўнічага, праўда, пражыў пасля гэтага менш трох гадоў [10, s. 72].

Палітычныя пазіцыі полацкіх паслоў акрэсліць даволі складана без верагодных крыніц. На паслоў маглі ўплываць розныя абставіны, іх рэлігійная і палітычная арыентацыя, а таксама ўплывовыя асобы, пачынаючы з мясцовага ваяводы Януша Кішкі, асабістая ці апасродкаваная прысутнасць якога на сойміке ў 1639 г. не выклікае сумнення. Пры гэтым варта адзначыць, што паслам прыйшлося лабіраваць інтарэсы ваяводы, не толькі як ураднікa. Справа ў тым, што Януш Кішка быў шчыльна звязаны з біржанскімі Радзівіламі, належаў да іх групоўкі [17, s. 171–172]. Але гэта не азначала, што полацкія паслы належалі да дэсідэнцкай апазіцыі, лідар якой, Крыштап Радзівіл, перад соймам 1639 г. не здолеў свае пастулаты правесці ні ў Ваўкавыску, ні ў Наваградку [18, s. 468]. Хутчэй наадварот. Так, сыходзячы з таго, што В. Яўгель быў звязаны з «полацкімі» Тышкевічамі, якія былі каталікамі, а Міхал Тышкевіч увогуле ўдзельнічаў у працэсе беатыфікацыі Язафата Кунцэвіча [19, s. 37–38], можна дапусціць, што паслы былі настроены на супрацу з каталіцкай фракцыяй сойма. Пра павольны трэнд полацкага сойміка ў бок падтрымкі каталіцызму сведчыць і яго пазнейшыя пастановы [16; 20, s. 194].

Нарэшце, асобнай праблемай у адносінах да абраных полацкім соймікам паслоў застаецца пытанне, ці ўдзельнічалі яны ў працы сойма. Пацвярджэння выканання В. Яўгелям і А. Віскоўскім пасольскіх паўнамоцтваў у раней вядомых крыніцах няма, зрэшты як і ў адносінах падаўляючай большасці паслоў ад ВКЛ. Па назіраннях саміх удзельнікаў сойма, у прыватнасці Альбрыхта Станіслава Радзівіла, канцле-

ра ВКЛ, да пачатку нарад прыбыла вельмі мала паслоў, «асабліва з Літвы» [21, s. 161]. Здзіўленне выклікае тое, што прадстаўнікі беларуска-літоўскіх паветаў масава праігнаравалі пачатак сойма ведаючы, што выпадала іх чарга прапаноўваць кандыдатуру соймавага маршалка. Паводле сабранай С. Травіцкай з розных крыніц інфармацыі, вядомы імёны толькі дзевяці паслоў ад ВКЛ на сойм 1639 г. [1, s. 597]. Полацкія паслы маглі як прыехаць пазней, так і праігнараваць сойм, але, прынамсі, вядомыя іх імёны.

***Змест пастулатаў.*** Захавалася сумарна дзевяць пастулатаў інструкцыі: чатыры на першым аркушы і пяць на другім. Выкананы ў традыцыйнай "патрыярхальнай" манеры, пачатковы пратакол інструкцыі нічым асаблівым не вылучаецца і плаўна праз спецыяльны сімвал (+) спалучаецца са стартавым пунктам:

− У першую чаргу, паслам належала падзякаваць Уладзіславу "*за айцоўскі клопат-роздум пра цэласнасць Рэчы Паспалітай*", пасля чаго было адзначана, што на перадсоймавым сойміке каралеўскія легаты давялі да шляхты інфармацыю ад караля "*як нашай айчыны, так і знешняй небяспекі датычную*" і далі сваім паслам "поўную моц" на кансультацыі "*шчырыя і сумленныя*" з іншымі пасламі;

− Другі ўтрымліваў яшчэ раз падзяку манарху за заслугі перад Айчынай і патрабаваў ад паслоў абмеркаваць магчымасць "укантэнтаваць" ці аддзячыць манарху, але на гэты раз удакладнялася, што зрабіць гэта належала без шкоды для "*публічнай справы*";

− Трэці пастулат змяшчаў патрабаванне разлікаў з войскамі, якія ахоўваюць межы, але з той умовай, каб Карона і ВКЛ асобна аплочвалі паслугі па ўтрыманні жаўнераў у сваіх замках;

− Чацверты пастулат у катэгарычнай манеры забараняў паслам прымаць удзел у соймавых пасяджэннях, якія б пралангіравалі вызначаны законам тэрмін соймавання: "*ні на адзін дзень больш, чым права дазваляе*";

− Пятым пастулатам палачане нагадвалі, што належала аднавіць полацкі замак, са спасылкай на канстытуцыю 1607 г. Матывацыя была прапанавана бездакорная, але неэфектыўная: "*каб той памежны замак, як брама ад Масквы да Княства Літоўскага, належным чынам быў адбудаваны*";

− Шосты пункт інструкцыі агаворваў актуальную для палачан праблему неразмежавання з Маскоўскай дзяржавай з боку Невеля і Себежа. Удзельнікі сойміка выказвалі незадаволенасць тым, што адпаведная камісія зацягвала працу, і ўбачылі ў гэтым жаданне камісараў атрымаць больш грошай з дзяржаўнага скарбу;

− Сёмы пастулат, самы аб'ёмны, па сутнасці з'яўляўся калектыўнай петыцыяй да караля з просьбай кампенсаваць выдаткі за "*вядомыя ўсяму свету заслугі*" полацкага ваяводы і гетмана Януша Кішкі;

− Восьмы пункт утрымліваў патрабаванне захаваць у моцы канстытуцыю 1638 г. і такім чынам гарантаваць нераздачу эканомій як ў ВКЛ, так і ў Кароне;

− Дзявяты пастулат, які таксама быў калектыўнай петыцыяй, змяшчаў патрабаванне аб вяртанні ці кампенсацыі панам Корсакам, Храпавіцкім, Віскоўскім, Невельскім, Юзафовічам і іншым маёмасных страт. Падставай такіх просьб была не толькі ідэя справядлівасці, але, як сцвярджалася, і прававыя нормы: "*акт уніі і канстытуцыі*" [2, арк. 22–22 адв.].

Ці былі пастулаты, уключаныя ў полацкую інструкцыю 1639 г., ва ўсім арыгінальнымі? Безумоўна, не. Большасць з гэтых пунктаў з'яўлялася фармальным адказам на прапановы каралеўскай інструкцыі, пачынаючы з пытанняў міжнародных адносін і скончваючы праблемай соймавай канклюзіі [1, s. 554]. Але адказы палачан, зрэшты, як і абывацелей многіх іншых паветаў "шляхецкай рэспублікі", не вельмі адпавядалі густу манарха і ўтрымлівалі даволі жорсткія абмежаванні паслам. Так, пры ўсім патрыятычным і патрыярхальным пафасе, які скразіць з уступу і першых пунктаў, інструкцыя не ўтрымлівала прамой згоды на прапановы караля па самых прынцыповых пытаннях – фінансавых. Больш таго, паслы атрымалі "*поўны дазвол*" не на ўхваленне падаткаў, а на абмеркаванне з іншымі парламентарыямі прапанаваных каралём праблем. "*Падзяку*" каралю належала арганізаваць такім чынам, каб гэта не нанесла шкоды "*публічнай справе*", г. зн., шляхце. Менавіта пастанова полацкага сойміка дазваляе падкарэктаваць назіранне, зрэшты, зробленае толькі са спасылкай на ваўкавыскую інструкцыю, што соймікі ВКЛ у 1639 г. былі настроены больш "*рэгалістычна*", г. зн., праманархічна, чым каронныя [1, s. 558]. Змест пастулатаў з першых старонак полацкай інструкцыі дазваляе сумнявацца, што сярод палачан панавалі прыхільнікі двара, што відаць па парадку фіксацыі пастулатаў, значная частка якіх прама ці ўскосна была прывязана да патрэб Полацкага ваяводства. Дарэчы, гэтым полацкая інструкцыя выразна адрознівалася ад ваўкавыскай і навагрудскай [22; 7].

З падобнай праграмай, як і ў 1639 г., палачане выязджалі на соймы і раней, і пазней. Патрабаванне забеспячэння замка полацкага запісана ў інструкцыі на каранацыйны сойм 1633 г. [3, с. 148]. У фрагментарна захаванай полацкай інструкцыі 1638 г. па сутнасці змест падобны па шостым, восьмым, дзявятым пастулаце інструкцыі 1639 г. [14]. У той ці іншай форме пункты інструкцыі 1639 г. карэлююцца і з пастулатамі полацкага сойміка на сойм 1640 г. (*патрабаванне адбудовы замка, выплаты доўгу ваяводзе, размежаванне з Масквой, захаванне цэласнасці эканомій, петыцыі за полацкія шляхецкія роды*) [16], што зрэшты зразумела, паколькі сойм 1639 г. скончыўся без зацвярджэння канстытуцый.

Пастулаты манарха ўдзельнікі сойміка творча перапрацавалі з улікам сваіх патрэб. Цікава, што ў цэнтры ўвагі інструкцыі апынуліся, у першую чаргу, лакальныя праблемы, як ВКЛ, так і Полацкага ваяводства. Насуперак уніфікацыйным тэндэнцыям, якія навязвала каралеўская інструкцыя, полацкая шляхта імкнулася выразна абмежавацца ад Кароны, ідэнтыфікавала сябе як частку дзяржаўнай арганізацыі ВКЛ. Інструк-

цыя 1639 г. ужо з першай старонкі дэкларуе фінансавы сепаратызм княства, а на другой увогуле дамінуюць справы рэгіянальныя. Асабліва варта звярнуць увагу на тое, што петыцыі ад шляхты трапілі ў першым дзясятку (!) пунктаў, чаго няма ў ніводнай раней вядомай полацкай інструкцыі XVI – першай паловы XVII ст.

Невыпадкова сярод найбольш актуальных для полацкага сойміка 1639 г. апынулася праблема размежавання з Маскоўскай дзяржавай. У хутчэйшым вырашэнні справы мясцовая шляхта была зацікаўлена не толькі з пункту гледжання стабілізацыі становішча на спрэчных тэрыторыях і ў ваяводстве ў цэлым, але і па прычыне высокіх выдаткаў на працу саміх камісараў. Так, за міжсоймавы сезон з 1635 г. па 1637 г. скарб ВКЛ выдаў на гэты артыкул 16 600 залатых, а з 1638 г. па 1639 г. – 13 300 залатых [23, s. 323-324]. Асобы, прызначаныя камісарамі, сапраўды атрымалі салідныя ганарары, якія дасягалі 2000 залатых. Як вынікае з соймавай справаздачы падскарбія ВКЛ, у складзе камісіі былі вядомыя на Полаччыне шляхціцы: Андрэй Канінскі і Ёзаф Кланоўскі, полацкі стольнік [24, арк. 543 адв. – 545]. Так што палачане мелі магчымасць атрымаць інфармацыю з першых рук і спытаць са сваіх жа калег на павятовым сойміке, але выносілі гэта пытанне на публічны соймавы разгляд. Тым не менш, заўважных наступстваў патрабаванне аб хутчэйшым размежаванні не мела. Сканчэнне працы парламента Рэчы Паспалітай без зацвярджэння канстытуцый у 1639 г. і 1640 г. прывяло да таго, што наступная камісія па размежаванні з Масквой набыла легальны статус і адпаведнае фінансавае забеспячэнне толькі на моцы пастановаў сойма 1641 г. У склад гэтай камісіі ўвайшлі і вышэйзгаданыя асобы [25, s. 28].

На сойміке прысутнічала вельмі моцнае лобі полацкага ваяводы Януша Кішкі, якога шляхта цаніла за вайсковыя заслугі яшчэ з часоў Жыгімонта Вазы [26, s. 195–196, 226], але адначасова пры яго жыцці і, магчыма, спрыянні дамаглася пацверджанага соймам права праводзіць элекцыю ваяводы [3, с. 22–24]. На сойміке з падачы, а магчыма, і ў прысутнасці ваяводы абмяркоўвалася пытанне кампенсацыі яго вайсковых выдаткаў: для абароны Полацка зімой 1632 – 1633 гг. ваявода з уласных сродкаў завербаваў конную харугву са 100 казакамі, 60 пехацінцамі і татарамі на чале з Дзевялтоўскім [27, s. 509]. Справа вяртання Кішке выдаткаваных сродкаў за яго "перамогі" пад Полацкам мела доўгую гісторыю і абмяркоўвалася яшчэ падчас Віленскай канвакацыі 1634 г. [26, s. 265]. Актуальнай яна заставалася і ў наступныя гады, але прысутныя ў 1639 г. на полацкім сойміке мелі некаторыя канкрэтныя прапановы. Так, палачане ведалі адкуль належала ўзяць на гэта сродкі, што сведчыць не гэтулькі пра іх абазнанасць у балансе дзяржаўнага скарбу, колькі пра зарыентаванасць самога ваяводы. Кампенсаваць фінансавыя страты Кішке на сойме не ўдалося, прынамсі выдаткі дзяржаўнага скарбу ВКЛ на 1639–1640 гг. такі артыкул не прадугледжвалі [24, арк. 546–547.]. Кампанія па "выбіванні" грошай з Уладзіслава Вазы праз уключэнне адпаведных петыцый у соймікавыя пастулаты працягвалася і перад соймам 1640 г. і ахоплівала розныя паветы, у тым ліку Ашмянскі і Менскі [28, s. 3; 29, s. 4]. Цікава, дзе браў Кішка аптымізм у гэтай справе, паколькі надзей на вяртанне наяўных грошай у ваяводы не было: шляхта не жадала плаціць падаткі, а ВКЛ з 1639 г. па 1643 г. іх увогуле не зацвярджала [23, s. 321–325]. Відавочна, ён часткова задаволіўся наданнямі ад Уладзіслава на сойме 1640 г., калі атрымаў Дрыскае староства і прыбыткі з мытных збораў [27, s. 509].

На сойміке ў Полацку без ўсялякага сумнення шляхта абмяркоўвала і іншыя актуальныя для таго часу пытанні, якія датычыліся як унутранага, так і знешняга становішча краіны, яе аўтарытэту [1, s. 554-560]. Так, несумненна, у цэнтры ўвагі жыхароў княства знаходзілася гісторыя з арыштам французскімі ўладамі брата Уладзіслава Вазы, каралевіча Казіміра. Скандал быў на слыху паўсюдна на Беларусі, на што звярнулі ўвагу і замежныя шпегі: па звестках маскоўскіх інфарматараў, у беларускіх гарадах у 1639 г. па загадзе караля масава "набывалі залатыя" на выкуп Казіміра з палону [30, с. 164]. Праўда, факт ігнаравання гэтай тэмы ў першых пунктах інструкцыі мог сведчыць пра панаванне ў полацкай шляхты негатыўнага стаўлення да каралеўскага брата. Ужо падчас соймавых пасяджэнняў двару прыйшлося фактычна выціснуць з Пасольскай ізбы публічныя спачуванні манарху. Прычынай такога стаўлення да Казіміра стала цыркуляцыя плётак пра ўяўныя, а магчыма, і праўдзівыя выказванні, у якіх каралевіч з пагардай ставіўся да палякаў, аддаваў перавагу немцам ды скардзіўся на няўдзячнасць супляменнікаў [21, s. 167].

***Вынікі.*** Знаходжанне такіх дакументаў, як інструкцыя полацкай шляхты на сойм 1639 г., сведчыць пра вялікі нераскрыты патэнцыял беларускіх архіваў, якія дазваляюць істотна дапоўніць і скарэктаваць наяўныя ў гістарыяграфіі факты.

Пастулаты полацкага сойміка 1639 г. у значнай ступені трэба лічыць унікальнымі. З'яўляючыся фармальна адказам на каралеўскую інструкцыю, якая фармулíравала актуальную соймавую праблематыку і на гэтай падставе інтэгравала інтарэсы двара і шляхты, полацкая інструкцыя 1639 г. была структуравана хутчэй у рэчышчы інтарэсаў грамадства, пры чым лакальнага. Гэта асабліва добра відаць па тым, у якім парадку палачане расстаўлялі свае прыярытэты: канешне, галоўным чынам іх непакоілі пытанні бяспекі і падаткаў, але тое, што ў першай дзясятцы пунктаў апынулася такая колькасць мясцовых пастулатаў, больш таго, петыцый, сведчыць пра жаданне дыстанцыянавацца ад навязаных манархам тэм ці мадыфікаваць іх пад свае патрэбы.

ЛІТАРАТУРА

1. Trawicka, Z. Sejm z roku 1639 / Z. Trawicka // Studia Historyczne. – 1972. – R. XV. – Z. 4 (59). – S. 551–597.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (НГАБ). – Ф. 694. Воп. 2. Спр. 6450.

3. Галубовіч, В. Полацкая шляхта і дынастыя Вазаў / В. Галубовіч. – Мінск : А.М. Янушкевіч; 2016. – 224 с.
4. Радзивиллы, князья (фамильный фонд). – Ф. 694. Оп. 2. Т. III. 1569 – 1923. – Минск, 1984 // НГАБ. – Ф. 694. Воп. 2.
5. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dział X.
6. Rachuba, A. Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569–1763 / A. Rachuba. – Warszawa: Wydawnictwo Sejmowe; 2002. – 376 s.
7. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dział II. Sygn. 1177. – S. 1–12.
8. Pamiętniki Filipa, Michała i Teodora Obuchowiczów (1630 – 1707) / Pod red. A. Rachuby. – Warszawa : DiG, 2003. – 640 s.
9. Галубовіч, В.У. Паслы Вялікага Княства Літоўскага на соймах Рэчы Паспалітай у 1633 – 1647 гг. у адлюстраванні гістарыяграфіі і крыніц / В.У. Галубовіч // Гіст.-археал. зб. – Мінск : "Беларуская навука", 2018. – Вып. 33. – С. 165–177.
10. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV – XVIII wieku : spisy. – T. V. : Ziemia Połocka i województwo Połockie XIV – XVIII wiek. / Pod red. H. Lulewicza. – Warszawa : IH PAN, 2018. – 306 s.
11. Полоцкая ревизия 1552 года / Ред. И. И. Лаппо. – М. : Унив. Тип., 1905. – 237 +XXII с.
12. Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo połockie 1667 i 1690 r. / Opracowali H. Lulewicz i A. Rachuba. – Warszawa : In-t Hist. PAN, 2018. – 182 s.
13. Kojałowicz, W. W. Herbarz rycerstwa W. X. Litewskiego tak zwany Compendium czyli o klejnotach albo herbach których familie stanu rycerskiego w prowincyach Wielkiego Xięstwa Litewskiego zażywają / W.W. Kojałowicz. – Kraków : Druk. "Czasu" Fr. Kluczyckiego i spółki, 1897. – 528 s.
14. Российская национальная библиотека в Санкт-Петербурге. Отдел рукописей. – Ф. 971. Авт. 124. Л. 166-168 об.
15. Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1582–1696) : spis / Pod red. A. Rachuby. – Warszawa : DiG, 2007. – 470 s.
16. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dział II. Sygn. 1197. S. 1–10.
17. Lulewicz, H. Elita polityczno-społeczna Wielkego Księstwa Litewskiego w połowie XVII wieku: Praca doktorska napisana w Instytucie Historycznym Uniwersytetu Warszawskiego / H. Lulewicz. – Warszawa, 1984. – 488 s.
18. Kempa, T. Wobiec kontrreformacji. Protestanci i prawosławni w obronie swobód wyznaniowych w Rzeczypospolitej w końcu XVI i pierwszej połowie XVII wieku / T. Kempa. – Toruń : Wydawnictwo Adam Marszałek, 2007. – 624 s.
19. Akta męczeńskie unii // Rocznik Towarzystwa historyczno-literackiego w Paryżu. – Rok 1868. – Paryż : Księgarnia Luxemburgska, 1869. – S. 1–63.
20. Augustyniak, U. W służbie hetmana i Rzeczypospolitej: Klientela wojskowa Krzysztofa Radziwiłła (1585 – 1640) / U. Augustyniak. – Warszawa : Semper, 2004 – 398 s.
21. Radziwiłł, A. S. Pamiętniki o dziejach w Polsce / A. S. Radziwiłł. – T. 2. – Warszawa : PIW; 1980. – 554 s.
22. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dział II. Sygn. 1174. S. 1–8.
23. Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej 1587–1648. Projekty-ustawy-realizacja. – Warszawa, 2006. – 440 s.
24. НГАБ. – Ф. 18. Воп. 1. Спр. 113.
25. Volumina legum. – T. IV. – Petersburg : Nakladem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1859. – 501+XVII s.
26. Akta Zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego. – T. II. : Okresy panowań królów elekcyjnych XVI – XVII wiek. – Warszawa : Neriton; In-t Historii PAN; 2009. – 452 s.
27. Wasilewski, T. Kiszka Janusz / T. Wasilewski // Polski słownik biograficzny. – T. XII. – Wrocław-Warszawa-Kraków, 1966 – 1967. – S. 508–510.
28. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dział II. Sygn. 1191. S. 1–4.
29. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. – Dział II. Sygn. 1188. S. 1–6.
30. Русско-белорусские связи : сб. док. (1570 – 1667 гг.). – Минск : Высшая школа, 1963. – 534 с.

*Пастуіў 29.11.2019*

## ДАДАТАК

***27(?) жніўня 1639 г. Полацк.***

***Соймікавая інструкцыя паслам Полацкага ваяводства Валерыяну Яўгелю і Аляксандру Віскоўскаму на шасцітыднёвы сойм Рэчы Паспалітай, прызначаны на 5 кастрычніка 1639 г. у Варшаве.***

|| [Арк. 22] **JNSTRUCTIA od nas Urzędnikow Ziemskich Grodzskich | Rycerstwo szlachty woiewodstwa Połockiego obywatelow: | dana Jch Mosciom Panom Posłom od nas zgodnie obranym Je(go) | Mosci Panu Waleryanowi Jawgielowi Horodniczemu Połoc|kiemu j Jego M(ił)osc*i* Panu Alexandrowi Wiskowskiemu na seim | szesc niedzielny w Roku Tysiąc szesc set Trzydziestym dzie|wiątym m(iesią)ca oktobra piątego dnia przypadaiący:**

Naprzod

Przy oddaniu Unizonego pokłonu naszego z wiernym poddanstwem pod nogi Ma|iestatu Je(go) Kro(lewskiej) M(iłosc)*i* Pana naszego Miłosciwego za rozne o zamysłach nie|przyiacielskich przestrogi y za obmyszlowanie oicowskie o całosci Rzeczypos|politey godne podziękwanie jch M(ił)osc Panowie Posłowie naszy jego Krolew|skiey m(iłos)ci Panu naszemu Miłosciwemu uczynic maią + Jz rozne jn pre|zętem deliberationem jego Krolewska Mosc Pan nasz Miłosciwy propono|wac raczy iako naszey oiczyzny necesytatys tak rozne perykula Przeto | we wszytkich punctach przez posły jego Kr(olewskiej) M(iłosc)*i* na seimiku proponowa|nych y na seim od jego Kr(olewskiej) M(iłos)ci podanych ych Mosc Panowie posłowie fi|dem et Constiętiam namawiac będą z drugimi Jch Mosciami Pany | Posłami w czym jch mosciom plenariam potestatem daiemy.

Za odwazne jego Kro(lewskiej) M(iłos)ci Pana naszego Miłosciwego dzieła A wiel|kie podięte trudy iako wszelaką wierni poddani powinnis my odda|wac gratitudynem tak naszą zyczemy Curospądere wdzięcznoscią Co | jch

Mosciom Panom posłom poruczamy aby o uContentowaniu Krola je(go) | M(iłosc)i z ynszemi jch mosciami Pany posłami tak Consulere Mieli | jako by jego Kro(lewska) M(iło)sc Pan nasz miłosc(i)wy bez wielko uimy Regi pub|lice ucontentowany zastawał.

Zołnierzowi Ukrainnemu zapłata Aby iako bene merytis obmyszlona | była zyczemy salicis iednak jurybus nostrys iako my w Wielkim Xię|stwie Lite(w)skim swemu tak ych m(iłos)ci Panowie Koronni swemu tesz zołnierzo|wi skarbu Korąnego zapłate obmyslic maią.

Jz to w zwyczay weszło ze ConCluzyie seimowe nad prawo przedłuzac | sie zwykły Co iest rei Publice pernicyozum jch mosc Panowie Posło|wie postrzec tego maią aby ani iednym dniem nad prawo prolągatia seimu | nie była. || [Арк. 22 адв.]

Zamek Połocki iako ukrainny aby opatrzony y budowany był według: | Constytuty Roku 1607 ych Mosc Panowie Posłowie pracowite w tym staranie | przyłozyc maią gdyz na tym wiele Rzeczy pospolitey nalezy aby ten: | Zamek Ukrainny iako wrota od moskwy do Xięstwa Litewskiego skutecznym | budynkiem zamknione były.

Comisyia z moskwą o granice Newla y Siebieza yz dotąd Concluzy nie w:|zieła y ograniczenie przez jch Mosc Panow Comisarzow nie Cunclodowane | Co iest R(zeczy)p(ospoli)tey pernicyozum starac sie jch Mosc Panowie Posłowie będą | Aby jch Mosc Panowie Comisarze do tey fun(c)tiei naznaczenie Mieli redere | racionem dlaczego ta sie Comisyia w prolągatią pusciła poniewarz y sty|pędyum skarbu na to nie małą sum(m)e wzieli.

Jasnie Wielmoznego Je(go) M(iłosc)*i* Pana Janusza Kiszki Woiewody Połockiego Hetma|na Polnego W(ielkiego) X(ięstwa) Lit(ewskiego) wielkie przeciwą oiczyznie Meryta przez | wszytek wiek oddowane wszytkiemu swiatu wiadome y Woiewodstwu naszemu | Połockiemu Czasu srogich ynCursy nieprzyiacielskich zawsze z odwagą | zdrowia stratą niemałą substanti z wielkim sum(p)tem oswiadczone | za co ze dotąd słuszney Jego Mosc nie odniosł nagrody starac sie jch mosc | Panowie Posłowie solicite będą Aby odwazne je(go) m(iłosci) dzieła y ten su(m)pt | z łaski je(go) Kro(lewskiej) M(iłosci) Pana naszego Miłosciwego nagrodzony był.|

A ze Je(go) Kro(lewska) Mosc Maiąc w disposity swoiey reszte poboru oszmianskiego | Jego M(iłos)ci Panu Woiewodzie Połockiemu Condenowac raczył starac sie ych | Mosc Panowie Posłowie będą aby za wzięciem tey sum(m)y od poborcy oszmian|skiego jego Mosc Pan Podskarbi W(ielkiego) X(ięstwa) Lit(ewskiego) Je(go) M(iłosci) Panu Woiewodzie List | Kwitacyny s tey sum(m)y dac raczył.|

EConomiie tak w Koronie polskiey iako w Wielkim Xięstwie Litewskim aby | według Prawa w całosci zostawały Jch Mosc Panowie Posłowie starac sie | będą zeby o tym Constytutia Roku 1638 do exzecuti przywiedziona była.|

Dobra jch Mosci Panow Korsakow jch m(ił)o(s)c(i) Panow Chrapowickich jch M(ił)osc(i) Pa|now Wiskowskich ych m(iłosci) Panow Newelskich ych Mosci Panow Jozefowiczow | y innych ych m(ił)osc(i) Kturych ych mosc na kozdym seimie dochodzą aby wed|ług Praw dawnych Ktore pokazą według uni y Constytutiy Kozdemu | z ych mosc Przywrocone były albo za to słuszną odmiane otrzymali | jch M(ił)osc Panowie Posłowie solicitae starac sie będą y zeby nie zadworem: | Ale u sądu ziemskie(go) y za apelatią do trybunału o takowe dobra rosprawe mieli | dla prędszey sprawiedliwosci. ||

*Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 6450. Арк. 22-22 адв.*

## "IN THE PREPARATION OF REVERENCE": UNKNOWN INSTRUCTIONS OF THE POLOTSK GENTRY AT THE SEJM OF THE POLISH-LITHUANIAN COMMONWEALTH IN 1639.

*V. GOLUBOVICH*

*The circumstances of Polatsk gentry instructions making are considered in the article, the contents of Polatsk gentry instructions that were worked out before the Seim of the Commonwealth held in October-November, 1639, are analysed. For the first time the subject of separate research is the postulates of Polatsk council, which took place in the end of August, 1639. The names of Polatsk ambassadors to the Seim is unique, previously unknown in historiography information from the document found in the National Historical Archives of Belarus. The instructions allow to correct and specify a number of well-known facts. The points of the instructions permit to determine the political priorities that were urgent for Polatsk province before the Sejm. The prohibition to bring into use new taxes and a great number of requests concerning the local problems of the province were entered in the first pages of the instructions. It is an obvious evidence of the local gentry disregarding the key wishes expressed in the Royal message to the council. The text of the instructions is published in the enclosure to the article.*

***Keywords:*** *the Embassy statement, Polotsk nobility, provincial diet, the Sejm of 1639.*